# РАЗДЗЕЛ VI
# БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

## ТЭМА 6.1. АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

ив библиотеки МГУ имен

Паэзія. Сучасная беларуская паэзія для дзяцей — з'ява складаная і шматгранная, цесна паяднаная з літаратурна-грамадскімі працэсамі апошніх дзесяцігоддзяў. Паэзія для дзяцей, як і ўся літаратура, пазбавілася ідэалагічнай зададзенасці, пэўнага схематызму, узбагаціўся яе нацыянальны каларыт, пашырыліся тэматычныя і жанрава-стылёвыя абсягі, памножыліся выяўленчыя сродкі. У мастацкай прасторы паэзіі для дзяцей спалучаюцца творчыя дасягненні розных пісьменніцкіх пакаленняў[1].

Адной з асаблівасцей беларускай дзіцячай паэзіі на сучасным этапе з'яўляецца цікавасць да культуры Беларусі, тра-

---

[1] У ёй плённа працавалі выдатныя прадстаўнікі старэйшага паэтычнага пакалення: Э. Агняцвет, В. Вітка, С. Грахоўскі, С. Новік-Пяюн, С. Шушкевіч. Да гэтага часу высокамастацкае паэтычнае слова нясуць дзецям кнігі такіях яркіх творчых індывідуальнасцей, як Р. Барадулін, Н. Гілевіч, А. Грачанікаў, В. Зуёнак, А. Лойка, К. Цвірка. У апошнія дзесяцігоддзі ў дзіцячую паэзію ўвайшлі творы таленавітых майстроў паэтычнага слова, выдатных знаўцаў дзіцячай псіхалогіі А. Вольскага, В. Гардзея, А. Дзеружынскага, К. Камейшы, Г. Каржанеўскай, У. Карызны, В. Лукшы, У. Мазго, М. Маляўкі, Н. Мацяш, М. Пазнякова, С. Панізніка, Г. Пашкова, Л. Рублеўскай, П. Пранузы, П. Прыходзькі, М. Чарняўскага і інш. Канец 80-х — 90-я гг. XX ст. — пачатак XXI ст. — час творчай актыўнасці ў галіне дзіцячай паэзіі А. Бадака, А. Грачанікава, Х. Гурыновіча, М. Дуксы, К. Жука, Х. Жычкі, В. Жуковіча, Т. Кляшторнай, І. Курбекі, Д. Марозава, У. Марука, У. Мацвеенкі, Т. Мушынскай, І. Муравейкі, У. Паўлава, А. Пісьмянкова, Л. Пранчака, П. Саковіча, Ю. Свіркі, П. Сушко, А. Спрынчан, Я. Хвалея, В. Шніпа, У. Скарынкіна, Х. Чэрні, В. Шымука, Л. Шырына, Р. Яўсеева і іншых аўтараў, творы якіх адрасаваны маленькаму чытачу.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дыцый нашага народа[1]. Так, у адным з раздзелаў кнігі "Гуканне вясны" ("Свята песенькай сустракаем") Васіль Жуковіч знаёміць маленькага чытача з цікавымі народнымі традыцыямі беларусаў, іх абрадамі, святамі: "*Гэткай смачнае куцці // Вы не елі ў жыцці. // І блінцы калядныя // Дужа-дужа ладныя. // А кісель, ды аўсяны, // Яшчэ лепшы за бліны*"[2] ("Калядная вячэра"). Нацыянальную адметнасць кнігі Міколы Чарняўскага "Сеў аўторак у аўто..." вызначаюць не толькі апаэтызаваныя народныя традыцыі, святы, маральныя нормы, але і выдзеленыя буйным шрыфтам беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, прыметы, загадкі, уласна аўтарскія забаўлянкі, лічылкі, жартоўныя дыялогі, блізкія па гучанні да народных.

Постаці знакамітых людзей – Еўфрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Кірылы Тураўскага, Кастуся Каліноўскага – прыцягваюць увагу Артура Вольскага, Васіля Жуковіча, Уладзіміра Мазго, Міколы Маляўкі, Алеся Пісьмянкова і інш. Значнасць дзейнасці славутага першадрукара імкнецца асэнсаваць і Міхась Пазнякоў: "*Паклаў ён* (Скарына. – рэд.) *дарогу да Слова, Святла, // За Матчыну мову паклікаў змагацца, // Каб вольнай заўсёды між вольных магла // Дзяржаваю Белая Русь называцца*"[3] ("Скарына"). Такія творы выхоўваюць пачуццё нацыянальнай годнасці і гордасці за свой край; некаторыя з іх вяртаюць да славутай мінуўшчыны роднага краю – яго старажытнага сцяга і герба (В. Жуковіч, "Пад вольным сцягам", "Выява пагоні"). Паэтаў хвалююць таксама трагічныя падзеі XX ст.: Вялікай Айчыннай вайны (В. Жуковіч, "Бусел над Хатынню"; А. Грачанікаў, "Каля помніка партызанскай славы «Прарыў»", "Перамога"; У. Карызна, "Думай, чалавек"; М. Маляўка, "Дзякуй за мір, Перамога!"; М. Пазнякоў, "На плошчы Перамогі"; Л. Пранчак, "Дзядуля"), вайны ў Афганістане (В. Жуковіч, "Скажы, зязюля...").

[1] Зборнікі "Запрашаем на калядкі" (1988) М. Маляўкі, "Гуканне вясны" (1992) В. Жуковіча, "Назвы, родныя здавён", "Адкрывай свой родны край" (2013) У. Мазго, "Дзяўчынка-беларуска" (1993) Л. Пранчака, "Радзіма" (2012) М. Пазнякова, "Акуніся ты ў крыніцу" (2003) П. Пранузы, "Сеў аўторак у аўто..." (1997) М. Чарняўскага і інш.

[2] Жуковіч, В. Калядная вячэра / В. Жуковіч ; уклад. А.І. Сачанка // Пралеска : хрэстаматыя. Мінск, 1997. С. 316.

[3] Радзіма : вершы. Мінск, 2012. С. 3.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тэме любві да Бацькаўшчыны прысвечаны шматлікія вершы Н. Галіноўскай, А. Грачанікава, В. Жуковіча, М. Маляўкі, У. Мазго, А. Пісьмянкова, М. Пазнякова, У. Карызны, К. Цвіркі і інш. Неабходна адзначыць, што для сучаснай беларускай дзіцячай паэзіі характэрна лакалізацыя вобраза Радзімы, які ўсё часцей атаясамліваецца з роднай вёсачкай, рэчкай, полем: "*Люблю я да болю // Гай, жытняе поле // І неба праменны блакіт. // Вось гэта карцінка – // Лес, Нёман, // Хмурынка – // Радзімы маёй // Краявід*"[1].

Многія паэты атаясамліваюць "малую" радзіму з вобразам маці: "*У бары майго дзяцінства // Льецца птушак звонкі грай, // Дыхай водарам смалістым // І душой адпачывай. // <...> Убірае ў сэрца гамы, // Фарбы, пахі, цішыню... // Прыязджаю я да мамы // І яго штоночы сню*"[2] (М. Пазнякоў, "У бары"). Прысвечаны вобразу маці зборнік вершаў і песень беларускіх паэтаў "Мама – сонейка маё..." (2008), змест якога склалі лепшыя творы класікаў і сучаснікаў.

Цесна звязана з тэмаю Радзімы пейзажная лірыка, якая складае асобную старонку беларускай дзіцячай паэзіі. Паэтызацыя шчымліва роднага і знаёмага краявіду выклікае ў дзіцяці пачуццё любові да роднай зямлі[3]. Пейзажныя замалёўкі прывучаюць маленькага чытача не толькі бачыць і разумець прыгожае вакол сябе, але і адчуваць тонкія нюансы сапраўднага паэтычнага слова: "*Чуеце, чуеце: // Песня чароў-*

[1] Незабудкі : вершы сучасных беларускіх паэтаў. Мінск, 2000. С. 36.

[2] Дарынка-весялінка : вершы, казкі, загадкі... Мінск, 1999. С. 6.

[3] Такое арганічнае адзінства эстэтычнага і этычнага заўважаецца ў зборніках паэзіі У. Карызны ("Насціна кніжка", 1995), Н. Галіноўскай ("Восень едзе ў магазін", 1990, "Звяры ў трамваі", 2013), У. Мазго ("Адкрывай свой родны край", 2013), Г. Пашкова ("Пціч", 1992), Х. Гурыновіча ("Пасадзім па дрэўцу", 1993, "Лес на далоні", 2001), В. Жуковіча ("Гуканне вясны", 1992, "Цудоўная краіна", 1997), М. Пазнякова ("Дарынка-весялінка", 1999, "У родным краі", 2009, "Песня прыроды", 2012, "У бары і на двары", 2012) і іншых аўтараў. У цудоўны свет прыроды ўводзяць чытача В. Гардзей (зб. "Сарочына цырульня", 2013), А. Лойка (цыкл "Вясёлы агарод"), М. Чарняўскі (раздзел "Дзе гэта казка" са зб. "Хто пакрыўдзіў кракадзіла?", 1999), А. Грачанікаў (зб. "Пераразвон азёр і бароў", 1998), В. Лукша (зб. "Адзіны ў свеце край", 2004), С. Грахоўскі (зб. "Птушыная дзяржава", 2000), Т. Мушынская (вершы са зб. "Вожыкі ў футбол гуляюць", 2008) і інш.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*ная // На лузе зарэчным // Духмяніць, бруіцца. // Мелодыя песні той // Шматкаляровая, // Быццам вясёлка // Пасля навальніцы.* <...>" (І. Муравейка, "Песня травы і кветак")[1].

Творы пра прыроду маюць вялікае пазнавальнае значэнне. Напрыклад, кніга В. Зуёнка "Па ельнічку, па бярэзнічку" (1996) уяўляе сабой своеасаблівы вершаваны даведнік пра беларускія грыбы. Цікавы ў гэтых адносінах і зборнік М. Пазнякова "Дарынка-весялінка" (1999), раздзелы якога ("Дзівосны свет", "Заапарк", "Нашы птушкі – не ўсе пяюшкі", "Акварыум") у даступнай форме знаёмяць маленькага чытача з некаторымі кветкамі, насельнікамі заапарка, рыбамі, якія могуць жыць у акварыуме, птушкамі. Цікавую і карысную інфармацыю пра родны край і сусвет знойдуць дзеці ў кнігах У. Мазго "Таямнічая планета" (2008), "Адкрывай свой родны край" (2013), Н. Галіноўскай "Звяры ў трамваі" (2013)[2]. Папулярнымі сталі творы, у якіх паэты заклікаюць малога чытача беражліва ставіцца да роднай прыроды, ахоўваць яе[3].

Сучасная дзіцячая паэзія прадстаўлена таксама творамі рэлігійнай тэматыкі: А. Вольскі, "Вялікдзень", Н. Галіноў-

[1] Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя / склад. : М.Б. Яфімава, М.В. Ляшук. Мінск, 1996. С. 456.

[2] Паказальнымі ў гэтым кантэксце з'яўляюцца выданні серыі "Свет вакол нас" рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і мастацтва" – "Чырвоная кніга ў казках і вершах" (2007), "Лясная кніга ў творчасці беларускіх пісьменнікаў" (2008), "Блакітная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў" (2009). Напрыклад, "Чырвоная кніга ў казках і вершах" знаёміць малога чытача з рэдкімі прадстаўнікамі беларускай флоры і фаўны, занесенымі ў Чырвоную кнігу. Другое выданне – "Лясная кніга ў творчасці беларускіх пісьменнікаў" – змяшчае разнастайныя ў жанравых адносінах творы Г. Аўсеенкі, Р. Баравіковай, А. Бадака, У. Мацвеенкі, М. Чарняўскага, В. Зуёнка, А. Зэкава, У. Мазго пра жыхароў лесу: птушак, звяроў, дрэвы, грыбы, ягады. Змест "Блакітнай кнігі", акрамя казак і апавяданняў, складаюць вершы В. Гардзея, М. Маляўкі, А. Спрынчан, В. Шніпа, У. Мазго, М. Чарняўскага, прысвечаныя водным "артэрыям і капілярам" Беларусі з іх раслінна-жывёльным светам.
У апошнія гады з'явіліся новыя серыі кніг для дзяцей : "Нашым дзеткам", паэтычная серыя "Журавінка".

[3] Вершаваныя зборнікі "Рэчка, рэчанька мая" (1991) Э. Агняцвет, "Світаюць сосны" (1986) М. Дуксы, "Пахі вясны" (1991) Т. Кляшторнай, вершы "Арабінка" Н. Галіноўскай, "Верабейка" М. Хведаровіча, "Сінічка ў рукавічцы" У. Мазго, "Мая рака" К. Камейшы і інш.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ская, "Божае благаслаўленне", М. Маляўка, "Міласціна" і інш. Так, напрыклад, М. Маляўка паэтызуе пачуцці маленькага хрысціяніна ў вершы "Крыжык": "*Крыжык светлы з храма // Мне прынесла мама, // Каб шчаслівы рос — // Без грахоў і слёз. // І прыгожа доўжыць // Мой жыццёвы шлях // Падарунак Божы — // Крыжык на грудзях*"[1].

На хвалі нацыянальнага адраджэння ў дзіцячай паэзіі па-новаму загучала тэма роднай мовы як сімвала незалежнасці, праявы нацыянальнай годнасці, вялікай духоўнай каштоўнасці ("На мове роднай" М. Мятліцкага, "Міколкавы пытанні" М. Пазнякова, "Родная мова", "Залацінкі", "Мы, беларусы" В. Жуковіча, "Гавары роднай мовай сваёй" А. Дзеружынскага): "*Не шанавалі роднай мовы — // Чужая месца заняла. // Ды адрадзіць душу і слова // Нам шанц гісторыя дала. // Народ не можа быць нямы. <...>*"[2].

Самую шматлікую групу сярод дзіцячых паэтычных твораў складаюць вершы маральна-этычнай праблематыкі[3], напрыклад, аб празмерным захапленні камп'ютарам: "Камп'ютарны вірус", "Света з Інтэрнэта" У. Мазго. Традыцыйна прысутнічаюць вершы выхаваўча-дыдактычнага характару, асновай якіх з'яўляецца станоўчы прыклад для дзіцяці: "Памочніца", "Таня-працаўніца" М. Пазнякова, "Маленькая памочніца", "А я дрэўца пасадзіў", "Дзеці суп варылі..." А. Дзеружынскага, "Змайстравалі сані..." М. Чарняўскага. Шматлікія паэтычныя творы даюць урокі прыстойнасці і сумленнасці, вучаць быць спагадлівымі, працавітымі, паважліва і прыязна ставіцца да людзей.

---

[1] Маляўка, М. Крыжык / М. Маляўка // Вясёлка. 2004. № 12. С. 12.

[2] Жуковіч, В. Мы, беларусы / М. Жуковіч // Гуканне вясны. Мінск, 1992. С. 45.

[3] Тут і гумарыстычна-сатырычныя творы, якія расказваюць пра найбольш распаўсюджаныя заганы характару дзіцяці: ляноту (Т. Кляшторная "Пазіраў з-за плота Пеця", А. Дзеружынскі "Заняты"), ганарыстасць (А. Грачанікаў "Бацька і сын"), хлуслівасць, хітрасць (Н. Галіноўская "Выхваляйка-Абяцайка", "Не хваліце Андрэя"), неахайнасць (Н. Галіноўская "Шыварат-навыварат", М. Чарняўскі "Борка і ўборка", Т. Кляшторная "Ела Наташа цукеркі"), сквапнасць (А. Грачанікаў "Цыркач", Т. Кляшторная "Па сцяжынцы ехаў Федзя"), задзірыстасць (А. Дзеружынскі "Свавольніца Іра") і інш.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сучасная беларуская паэзія для дзяцей характарызуецца жанравай разнастайнасцю: вершы, вершаваныя казкі, паэмы, калыханкі, каламбуры, забаўлянкі, гульні, жарты, лічылкі, загадкі, скорагаворкі, пацешкі, перакруткі, чыстагаворкі і інш.

Асобнае месца займае загадка, якая мае не толькі пазнавальнае значэнне, але і спрыяе развіццю фантазіі, асацыятыўнага мыслення, назіральнасці і ўвагі[1]. Напрыклад, паэтычны зборнік М. Пазнякова "Ехаў поўны воз дзівос" цікавы загадкамі-антонімамі, а таксама метаграмамі, шарадамі, анаграмамі. Дакладнасцю, паэтычнай вобразнасцю вызначаюцца і загадкі са зборніка "Дарынка-весялінка" (раздзел "Таямнічы куфэрак"). У кнігу ўключаны таксама казкі, скорагаворкі, каламбуры, смяшынкі (раздзелы "Святло дабрыні", "Сорак ножак у сараканожак"), паэтычная азбука і лічэбнік (раздзел "Я чытаю і лічу"). Гумарам, насмешлівасцю, гарэзлівасцю адрозніваюцца загадкі У. Мацвеенкі. У зборнік "Староначкі з моўнай скарбоначкі" (2008, раздзел "Калейдаскоп загадак") увайшлі загадкі рознага кшталту: загадкі-жарты, загадкі-шарады, загадкі-рыфмаванкі, загадкі-анаграмы, загадкі-метаграмы, загадкі-лагагрыфы, загадкі-слоўкі-двухбакоўкі, загадкі-задачкі і інш. Загадкі-задачкі У. Мацвеенкі прадстаўлены ў калектыўным паэтычным зборніку для дзяцей малодшага ўзросту "Колькі дзе чаго" (2013).

Развіццю кемлівасці, фантазіі, творчых здольнасцей маленькага чытача садзейнічаюць займальныя азбукі[2]. Так, Р. Барадулін ("Азбука. Вясёлы вулей")[3] распавядае дзецям пра

[1] Зборнікі "Камп'ютарныя сакрэты" (2002), "Палёт з Карлсанам" (2006) Н. Галіноўскай, "Загадкі Зайкі-Загадайкі" (1990), "Загаданачка" (1993), "Загадкі з хаткі дзеда Уладкі" (1999) У. Мацвеенкі, "Прыгоды марахода" (2002), "Таямнічая планета" (2008) У. Мазго, "Ехаў поўны воз дзівос" (1990), "Дарынка-весялінка" (1999), "Падарожжа ў краіну загадак" (2007) М. Пазнякова; "Хто знае – адгадае" (1997) У. Паўлава і інш.

[2] "Азбука не забаўка" (1985), "Азбука. Вясёлы вулей" (1995) Р. Барадуліна, "Жывая азбука" (1995), "Азбукі" (1997) А. Дзеружынскага, "Вясёлая азбука" (1992) У. Ліпскага, "Азбука ў загадках" (1992), "Займальны родны алфавіт" (2013) У. Мацвеенкі, "Загадкавая азбука" (2012) У. Мазго, "Лемантар" (1993) М. Танка, "Хітрыя літары" (2004) І. Курбекі, "Елачка і ёлачка: забаўная азбука" (1991) С. Сокалава-Воюша і інш.

[3] Аснову зборніка Р. Барадуліна "Азбука. Вясёлы вулей" склалі вершы кнігі "Азбука не забаўка", перапрацаваныя і дапоўненыя.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

незвычайны вулей і пчолак. Пчолкі — гэта літары, якія жывуць у своеасаблівым доміку — алфавіце. Падабенства паміж літарамі і пчолкамі паэт бачыць у тым, што як пчолы збіраюць нектар і напаўняюць ім соты, так людзі бяруць з кніг разнастайныя веды. Паэт нібы ажыўляе літары і займальна, часам з гумарам прадстаўляе іх маленькаму чытачу: *"Я ў канцы быць не магу! — // Выстаўляе Я нагу. // Той, хто якае зашмат, // Ставіць сам сябе назад"*[1] ("Азбука. Вясёлы вулей"). На кожную літару алфавіта Р. Барадулін падбірае скорагаворкі (хуткамоўкі), засяроджвае ўвагу на некаторых фанетычных, граматычных, словаўтваральных асаблівасцях беларускай мовы.

Своеасаблівай мастацкай энцыклапедыяй для дзіцяці з'яўляюцца кнігі А. Дзеружынскага "Жывая азбука" (1995), "Азбукі" (1997). Напрыклад, "Жывая азбука" ўводзіць малога чытача ў цудоўны свет прыроды, адкрываючы цікавыя і нязведаныя старонкі ў краіне кветак, жывёл, птушак. Займальна навучае чытанню, абуджае дапытлівасць і назіральнасць кніга "Азбукі", якая складаецца з вершаў, аб'яднаных тэматычнымі групамі: азбукі мужчынскіх імён, азбукі жаночых імён, кветак, дрэў, жывёл, птушак, грыбоў, лекавых раслін, прыроды.

У апошнія дзесяцігоддзі ўсё часцей сталі выходзіць зборнікі, у якіх чытач можа знайсці вершы-пераблытанкі, невярагодзіцы, забаўлянкі, вымаўлянкі, лагагрыфы, лічылкі, скорагаворкі (хуткапрамаўлянкі), задачкі, каламбуры, калыханкі, небыліцы і г. д.[2] У кнігах У. Мацвеенкі, У. Мазго прадстаўле-

[1] Барадулін, Р. Азбука. Вясёлы вулей / Р. Барадулін. Мінск, 1994. С. 17.

[2] "Выпаў грук у грома з рук" Р. Барадуліна (2009), "Выйшаў зайчык пагуляць" А. Вольскага (2009), "Сонечны кошык" (2009) М. Чарняўскага", "Свет — дзівосны" (2000), "Колькі ў сонейка сяброў!" (2013), "Хто хацеў бы пакатацца" (2014) В. Жуковіча, "Ехаў поўны воз дзівос" (1994), "Гульня слоў" (2011) М. Пазнякова, "Дабранач" (2003), "Староначкі з моўнай скарбоначкі" (2008) У. Мацвеенкі, "Як Гаўка ў космас збіраўся" (2013) А. Зэкава, "Прыгоды марахода" (2002), "Цуда-вуда" (2008), "Таямнічая планета" (2008) У. Мазго, "Пачынайце дзень з усмешкі" (2013) М. Маляўкі і інш. Цікавымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца кнігі М. Пазнякова з серыі "Свет вакол нас", выдадзеныя ў 2011—2013 гг. : "Гульня слоў" (2011), "Песня прыроды", "Птушынае свята", "Родная мова", "У бары і на двары", "У заапарку", "Свята ўраджаю" (2012), "Вадзяць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ны амаль усе формы і жанры дзіцячай паэзіі. Больш за тое, У. Мацвеенка дасціпна і цікава вучыць дзяцей, як самім трэба складаць творы. Займальны матэрыял для конкурсаў і віктарын, гульняў і інсцэніровак змешчаны ў кнігах А. Зэкава "На арэхавым кані" (2003), "Мянтуз сярод мядуз" (2007), "Зязюля Гулюля" (2011).

Шмат займальных прыгод, незвычайных гісторый і цікавых падарожжаў у вершаваных казках[1]. Так, у паэме-казцы "Пра Янку, Ганку і казак вязанку" У. Паўлаў цікава распавядае пра Космас, яго адкрывальнікаў, знакі Задыяка. Не толькі пазнавальную, але і дыдактычную накіраванасць маюць казкі У. Мазго. Сапраўды, вопыт дзівака Сіваграка пераконвае: "*Трэба сем разоў адмераць, // Каб пасля ўжо раз даверыць... // <...> Калі справу робіш спехам – // Абярнуцца можа смехам!..*"[2]. Развіццю фантазіі, вобразнага ўяўлення, выхаванню ў дзяцей лепшых маральных якасцей садзейнічаюць творы "Пра кніжку, Цішку і мядзведзя Мішку" Р. Тармолы-Мірскага, "Дзядзькаў чай" Р. Яўсеева, "Казка пра Івана-ганчара і пачвару-цара" А. Грачанікава, "Вада ў ступе" У. Паўлава.

Творча выкарыстоўваюцца дзіцячымі паэтамі фальклорныя матывы і вобразы[3].

---

дрэвы карагод...", "Кожны добрай справе рад", "Сонейка ўсміхаецца", "Сорак ножак у сараканожак", "Залатое поле", "Званочкі велічнай красы", "Наша сям'я " (2013) і інш.

[1] "Ад казкі – да спектакля" (1998) В. Жуковіча, "Як ліса вучылася лётаць" (1991), "Адзіны ў свеце край" (2004) В. Лукшы, "Як жывуць казкі" (1994) М. Маляўкі, "Завітала ў госці казка" (2014) У. Мазго, "Чыж вярнуўся з-за мяжы" (2003) У. Марука, "Чароўнае вочка" (2003) У. Карызны, "Два сонцы" (2004) А. Касько, "Кенгуру ці кенгура? (2013) А. Зэкава, "Тандэм", "Чаму Авадзень плача", "Чаму ў Боці чырвоныя ногі і дзюба" (зб. "Дабранач", 2003) У. Мацвеенкі, "Лясное дзіва", "Кот Мурлыка", "Здарэнне з цёткай Слізготкай", "Пагоня" (зб. "Хто пакрыўдзіў кракадзіла?", 1999), "Дзеткі-краскі, любіце казкі?" (зб. "Сонечны кошык", 2009) М. Чарняўскага і інш.

[2] Завітала ў госці казка : казкі зблізку і здалёку. Мінск, 2014. С.11, 14.

[3] На народнай аснове напісаны творы С. Новіка-Пеюна (зб. "Зорачкі ясныя", 1986), В. Жуковіча (зб. "Гуканне вясны", 1992, "Цудоўная краіна", 1997, "Свет – дзівосны", 2000), Н. Гілевіча (зб. "Добры чалавек", 1987), А. Лойкі (зб. "Кніжка Надзейкі", 1987, "Пра дзеда Аяяй і бабку Оёёй", 1994), В. Гардзея (зб. "Коцікі на вярбе", 1988), А. Грачанікава (зб. "Зорны

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сучасная беларуская дзіцячая паэзія далучае падрастаючае пакаленне да агульначалавечых каштоўнасцей, да духоўных скарбаў народа, абуджае патрыятычныя пачуцці, заклікае любіць свой край, берагчы яго непаўторную прыроду, паважаць чалавека працы, спрыяючы тым самым гарманічнаму выхаванню асобы.

Паэзія для дзяцей вызначаецца багаццем тэматыкі, праблематыкі, жанравай разнастайнасцю. Асноўнымі тэндэнцыямі яе развіцця з'яўляюцца тэматычнае абнаўленне, жанравае і зместавае ўзбагачэнне, адыход ад схематызму, выкарыстанне фальклорных набыткаў, накіраванасць на выхаванне ў кантэксце нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

палёт", 1988), М. Танка (зб. "Сярод лясоў наднёманскіх", 1987), М. Чарняўскага (зб. "Сеў аўторак у аўто...", 1997) і многіх іншых аўтараў.

[1] Тут адбываецца істотнае сэнсавае разыходжанне ў параўнанні з народнай казкай "Калабок", дзе мы знаёмімся з такой рысай характару, як хітрасць.